# 23 кастрычніка - 200 гадоў з дня нараджэння А. Плуга (1823-1903), пісьменніка і публіцыста

Творчасць Адама Плуга (сапраўднае прозвішча Пяткевіч Антоні Антонавіч) - адна з важных з'яў у беларуска-польскім літаратурным сумежжы. Ён узнімаў у польскай літаратуры беларускую тэматыку, папулярызаваў дасягненні беларускай літаратуры XIX ст.

Нарадзіўся пісьменнік у в. Замосце Слуцкага павета Мінскай губерні (цяпер Слуцкі раён Мінскай вобласці) у сям’і арандатара. З 1831 г. жыў у в. Жукаў Барок на Стаўбцоўшчыне. У 1842 г. скончыў Слуцкую гімназію. У 1845-1846 гг. вучыўся на філасофска-літаратурным факультэце Кіеўскага ўніверсітэта, але з-за цяжкага матэрыяльнага становішча пайшоў працаваць настаўнікам. У 1859 г. А. Плуг выехаў у Жытомір, заснаваў там мужчынскую гімназію з пансіёнам і ўтрымліваў яе да 1861 г. У далейшым часта мяняў месцы жыхарства, займаўся гувернёрскай практыкай. У снежні 1874 г. А. Плуг пераехаў у Варшаву. У 1875-1879 гг. працаваў сурэдактарам, у 1879-1890 гг. - рэдактарам часопіса «Klosy» («Каласы»). Потым А. Плуг быў галоўным рэдактарам «Wielkiej Encyklopedii Powszechenej ilustrowanej» («Вялікай усеагульнай ілюстраванай энцыклапедыі») (1891- 1903). Адначасова працаваў літаратурным кіраўніком часопіса «Wedrowiec» («Вандроў- нік») (1894-1899), уваходзіў у склад рэдакцыі газеты «Kurjer Warszawski» («Варшаускі кур’ер») (1899-1903).

Публікаваўся А. Плуг з 1847 г. Сваё першае апавяданне «Пра тое, як людзі час марнуюць» («Падарожжа маёй думкі па вуліцах малога мястэчка») ён напісаў у 1842 г., яшчэ ў час вучобы ў Слуцкай гімназіі. Большасць твораў пісьменніка тэматычна звязана з Беларуссю. Адам Плуг быў добра знаёмы з У. Сыракомлем, якому прысвяціў свой першы верш «Гара Замчышча». У ім выкарыстаны матывы беларускіх народных казак. У 1849 г. А. Плуг напісаў на беларускай мове чатыры апавяданні і адну легенду, але да нашых дзён захавалася толькі апавяданне «Кручаная баба» (упершыню апублікавана ў 1918 г.), якое паклала пачатак традыцыі апрацоўкі гумарыстычна-сатырычных народных апавяданняў у літаратуры. Асаблівасцю твора стала шырокае выкарыстанне беларускай лексікі і фразеалогіі. У першым паэтычным зборніку «Родны загон» (т. 1-3, 1854) пісьменнік дасканала апісаў рэаліі беларускага жыцця. Фальклорныя і хрысціянскія матывы шырока прадстаўлены ў зборніку «Каласы з роднай нівы» (1856). У час кароткага знаходжання ў Мінску ў 1856 г. ён пазнаёміўся з В. Дуніным-Марцінкевічам. У гэтым жа годзе напісаў верш «В. Марцінкевічу, аўтару твораў на беларускай гаворцы». На народных паданнях і ўражаннях маладосці заснаваны вершаваныя гутаркі пісьменніка «Жукаў Барок» (1849), «Родная песенька» (1856), «Сарока» (1867). У аповесцях «Споведзь» (1849), «Дзетазабойца» (1850), «Нянька» (1857); раманах «Дух і кроў» (1859), «Афіцыяліст» (1866-1867) А. Плуг адлюстраваў важныя сацыяльныя праблемы, паказаў жыццё шляхты і сялянства. Гэтыя творы спалучаюць у сабе тэндэнцыі рэалізму і рамантызму, што праяўляецца ў падрабязнасцях апісання маральна-псіхалагічнага стану персанажаў, іх душэўных перажыванняў, пры адначасовым паказе тыповых побытавых умоў жыцця, паўсядзённых клопатаў. Як публіцыст надрукаваў у часопісе «Каласы» шмат беларусазнаўчых матэрыялаў, сярод іх - «Слонім» (1874), «Напалеон Орда і яго альбом відарысаў» (1875), «Аляксандр Караль Гроза» (1876), «Смольгаў: роднае месца Ул. Сыракомлі», «Ігнат Ходзька і агульная характарыстыка яго прац», «Руіны замка ў Міры» (1877), «Магіла Яна Чачота ў Ротніцы пад Друскенікамі»

(1878), «Баруны» (1879), «Браніслаў Залескі» (1880), «Аляксандр Ходзька» (1881), «Нясвіж» (1883), «Ігнат Дамейка ў Варшаве» (1884), «Адам Ганоры Кіркор» (1886) і інш. Публікацыі пісьменніка ўтрымліваюць каштоўны фактычны матэрыял, успаміны, у іх апісаны побыт, традыцыі і іншыя прыкметы нацыянальнага мастацкага каларыту, краявіды, рамантызаваныя пейзажы. У розных выданнях А. Плуг змясціў беларускія нататкі «Вобраз з узбярэжжа Нёмана: урывак з успамінаў дзіцячых гадоў, праведзеных з бацькамі ў Жукавым Барку» (1883), «Люд Літоўскага Палесся» (1884), «Над Гарынню: нататкі з падарожжа» (1887) і інш. Пісьменнік адзін з першых перакладаў на польскую мову творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Г. Гейнэ, В. Гюго, А. Пушкіна, У. Шэкспіра. На беларускую мову яго асобныя творы пераклалі П. Бітэль, У. Мархель, К. Цвірка. Адам Плуг быў членам многіх дабрачынных, навуковых і літаратурных таварыстваў, камітэтаў, адным з арганізатараў беларускага літаратурна-асветніцкага гуртка.

**Плуг, А**. Жукаў барок; Станіславу Манюшку; В. Марцінкевічу, аўтару твораў на беларускай гаворцы; Кручаная баба; Нянька (фрагмент) / Адам Плуг // Літаратура Беларусі ХІХ стагоддзя : анталогія / [укладальнікі: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навуковы рэдактар А. В. Мальдзіс]. - Мінск, 2013. - С. 604-610.

*Аб жыцці і творчасці пісьменніка*

**Плуг Адам** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2001. - Т. 12. - С. 435.

**Плуг Адам** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2008. - Т. 6. - **С. 108.**

**Плуг Адам** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. - Мінск, 1999. - Т. 5. - С. 514.

**Плуг Адам** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. - Мінск, 2015. - Т. 6. - С. 186-187.

**Плуг Адам** // Минская область : энциклопедия : [в 2 т.]. - Минск, 2007. - Т. 2. - С. 498.

**Плуг Адам** // Асветнікі зямлі Беларускай, Х - пачатак ХХ ст. : энцыклапедычны даведнік. - 2-е выд. - Мінск, 2006. - С. 330.

**Плуг Адам** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса. - Мінск, 1995. - Т. 5. - С. 35-38.

**Мархель, У.** Адам Птуг (1823;-1903) / У. Мархель // Літаратура Беларусі ХІХстагоддзя : анталогія / [укладальнікі: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навуковы рэдактар А. В. Мальдзіс]. - Мінск, 2013. - С. 603-604.

**Хмяльніцкі, М.** В. Каратынскі і А. Плуг: жыццёвыя дарогі і творчыя здабыткі / Мікалай Хмяльніцкі // Вінцэсь Каратынскі ў беларуска-славянскім літаратурным узаемадзеянні: матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (Мінск, 29 верасня 2006 г.) / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут літаратуры імя Я. Купалы ; [рэдкалегія: У. Мархель (галоўны рэдактар) і інш.]. - Мінск, 2006. - С. 135-140.

**Хмяльніцкі, М. М.** Паэтыка раманаў Адама Плуга / М. М. Хмяльніцкі // Славянскія літаратуры: праблемы развіцця : зборнік артыкулаў / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Філалагічны факультэт, Кафедра славянскіх літаратур ; пад рэдакцыяй І. А. Чароты. - Мінск. 2003. - С. 61-71.

**Касілава, Н.** Адам Плуг (1823-1903) / Ніна Касілава // Планета - семья. - 2018. - № 2. - С 43-44.

**Каліна, Я.** Адам Плуг / Ян Каліна // Роднае слова. - 1998. - № 10. - С. 39-42.

Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. — 2023. — № 5. — С. 13–15 (Дадатак “Даты беларускага календара: 2023”).